ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 74 (456) Серада 6 ліпеня 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню У СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ | Год выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

Да ўвагі ўсіх комсамольскіх організацый

Паведамляецца, што, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў і дзень гадавіны Констытуцыі СССР праводзяцца 10-га ліпеня.

ЦК ЛКСМБ.

Будзем гатовы

Падрыхтоўка вайны, якая вядзецца капіталістычным сьветам пад кіраўніцтвам Англіі супроць Савецкага Саюзу, ня толькі не аслабела, а, наадварот, **с кожным днём усё больш і больш узмацняецца.** Гэта падрыхтоўка азначаецца адносінамі да нас Англіі, яе патугамі зьнізіць у міжнародных адносінах удзельную вагу СССР і імкненьнем утварыць адзіны фронт супроць краіны Саветаў. З другога боку—падрыхтоўка пацьвярджаецца і разбураючай работай ворагаў унутры нашай краіны.

Да фактаў падрыхтоўкі нападу на нас павінна быць прыкавана ўвага комсамольца, маладога рабочага і селяніна. Галоўнае зводзіцца да таго, каб кожным членам саюзу і кожным беспартыйным была асэзнана тая пагроза, якая паўстае перад нашай краінай і ў адпаведнасьці з гэтым быў-бы зроблены паварот у бок увагі да здарэньняў і задач дню.

Трэба прызнацца, што ў нас яшчэ ёсьць комсамольцы і беспартыйная моладзь, якія з пытаньнямі міжнароднай політыкі знаёміліся адрывачна, не сыстэматычна.

Перажываемы намі момант патрабуе ад нас найбольшай увагі да таго, што робіцца навакол краіны Саветаў. Для кожнага члена саюзу гэта тым болей неабходна, бо бяз глыбокага азнаямленьня з здарэньнямі, якія адбываюцца ў міжнародных адносінах, ён ня зможа выканаць сваю ролю, ролы прапагандыстага здарэньняў дню перад беспартыйнай масай.

Небясьпека вайны, якая зараз утвараецца, патрабуе ад працоўных мас і моладзі найвялікшага згуртаваньня навакол нашай партыі і комсамолу.

Малады рабочы і селянін павінен усей сваёй энэргіяй, усей сваёй ініцыятывай дапамагаць партыйным і комсамольскім ячэйкам у іх складанай рабоце.

Адной з галоўнейшых умоў нашай барацьбы супроць вайны зьяўляецца **ўзмацненьне справы соцыялістычнага будаўніцтва.** У сувязі з гэтым, перад моладзьдзю стаіць задача **найбольш актыўнейшага ўдзелу ў гаспадарчым жыцьці рэспублікі.**

Нядбайныя адносіны да справы, прагулы, недысцыплінаванасьць у сучасны момант абсалютна недапусьцімы. Гэтаксама і ў галіне культурнай работы патрэбна найбольш актыўная дзейнасьць.

Кожны з нас павінен **узмацніць увагу да Чырвонай арміі, да дапрызыўнай падрыхтоўкі, да ўдзелу ў ячэйках ТСААвіяхэму і ў стралковых гуртках. У справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны моладзь павінна быць найболей актыўнай.**

Перажываемы намі момант прымушае комсамольца **быць дысцыплінаваным, узмацняць шэрагі саюзу, дапамагаць партыі і саюзу выганяць з сваіх шэрагаў тыя элемэнты, якія нічога агульнага з партыяй і саюзам ня маюць.**

Урэшце, кожны комсамолец павінен быць прыкладам для беспартыйнай моладзі ва ўсіх пачынаньнях партыі і саюзу, накіраваных да ўзмацненьня гаспадарчай, культурнай і ваеннай моцы нашай краіны.

У краіне Саветаў

Пагроза ваеннай небясьпекі не парушыла вялікага пляну соцыялістычнага будаўніцтва, а, наадварот, яна стварыла найстрогую гаспадарчую дысцыпліну ў пролетарскіх шэрагах. Шырока разгорнутая ўрадам і партыяй кампанія за рэжым экономіі сустракае яшчэ большае падтрыманьне працоўных.

Працоўныя добра разумеюць, што выхад надыходзячай вайны будзе вырашацца ня толькі сілай асобных тэхнічных дасягненьняў у ваенных адносінах, як, галоўным чынам, узроўнем экономічнага становішча тэй ці іншай дзяржавы.

З гэтай прычыны бяз усякай панікі, згрупаваным фронтам, яшчэ з большай упартасьцю ажыўляе рабочая кляса ўсе гаспадарчыя дзялянкі вялікага будаўніцтва ў краіне Саветаў—такі першы вынік адказу працоўных на пагрозу вайны.

Новая будоля

У былой «бацькаўшчыне» Уркварту—на Рэйдэры праведзена агромністая адбудоўчая праца без чужаземных крэдытаў. Нанава пабудавана вялікая фабрыка, адзіная ў СССР, якая дае концэнтрат (растворы і сплавы) цынку і волава. Абсталявана яна па апошняму слову тэхнікі. У год фабрыка будзе даваць мільёны пудоў савецкага цынку, які раней набываўся па вельмі высокіх цэнах за межамі.

На рацэ Ульбе будуецца магутная электрастанцыя. Тут-жа будуецца рабочы пасёлак з больніцамі, клюбамі і школамі. Усе будынкі электрафіцыруюцца. На будаўніцтве занята больш 3-х тысяч сталых рабочых, а з сэзоньнікамі даходзіць ... тысяч чалавек.

...цца энэргічная праца па адбу...цыяністага заводу, прадукцыя ...высіць здабычу пры ранейшых ...—ангельцах.

...танцыі Чудава, Наўгародзкай гу... зусім пераабсталяваная нанава ...мі, прывезенымі з Швэйцарыі, ...овая фабрыка. Дзякуючы новаму ...яваньню аднадзённая выпрацоўка ...чак павялічылася на 30 проц., з прычыны чаго паднялася зарплата на 22 проц. і брак зьнізіўся ў два разы.

На заводзе «Красный Выборжэц» у Ленінградзе вядзецца праца па пабудове новай электраліцейнай майстэрні па эўрапэйскаму абразцу. Гэтая майстэрня будзе першай ластаўкай ужываньня ў СССР навейшага электрычнага абсталяваньня ў ліцейнай справе. Будынак для майстэрні ўжо гатовы. У майстэрні ўстанаўліваюцца краны і 8 электрычных пячэй для расплаўкі мэталяў. Каштоўнасьць майстэрні вылічаецца ў 3-х мільёны рублёў. Гадавая экономія на новым абсталяваньні складзе 1 мільён 379 тысяч рублёў.

У Сьвярдлоўску блізка ля гораду на агромністых тарфяных балотах вырасла новая магутная электрастанцыя. Станцыя гэта будзе мець раённае значэньне. Ужо ў гэтым годзе станцыя павінна даць 10,5 мільёнаў кілават-гадзін электраэнэргіі. Такая магутнасьць дазваляе асьвятляць ня толькі горад, але даваць энэргію і на шматлікія заводы раёну.

Гэтае кароткае пералічэньне далёка ня вычэрпвае ўсіх пачатых і закончаных ужо капітальных прац.

Мэханізацыя нафтавай прамысловасьці


Самым распаўсюджаным нашым таварам на замежных рынках зьяўляецца нафта. На паліўную прамысловасьць урад зварачае асабліва сур'ёзную ўвагу. Так, напрыклад, на капітальнае будаўніцтва па трох трэстах (Азнафта, Грознафта і Донвугаль) дзяржавай за апошнія тры гады патрачана звыш паловы мільярда рублёў (552,6 мільёну). Значная частка гэтых сродкаў была зрасходавана на мэханічнае пераабсталяваньне прадпрыемстваў, на зьмяненьне спосабаў здабычы вугалю і нафты.

Дзякуючы вялікім капітальным затратам гэтую галіну прамысловасьці ўдалося настолькі перазброіць тэхнічна, што яна не адстае па свайму ўзроўню ад амэрыканскай тэхнікі.

Побач з гэтым прыступлена да вялізарнага нафтаправоднага будаўніцтва.

У сучасны момант ідзе праца па правядзеньню нафтаправодаў Грозны-Туапсэ і вырашана пытаньне аб газаправодзе Баку-Батум.

Страты на пабудову ўяўляюцца, прыкладна, у суме 20-25 мільёнаў рублёў. Пабудову маркуецца закончыць у 1928 г.



4 гады вырашалася справа

Цікавы экспонат

Нядаўна ў РСІ папала цікавая справа грамадзяніна **Розума Мікіты** вёскі Папэка, Бабруйскай акругі. **Справа гэтая датычыцца зямельнай цяжбы. Яна цягнецца з 1923 году. Разраслася ў 25 вялікіх аркушаў.**

Толькі нядаўна 28-га чэрвеня, па катэгорычнай прапанове РСІ, яна была вырашана ў асобай калегіі па зямельным справам пры Наркамземе.

У адным з чарговых нумароў нашай газэты мы дадзім падрабязнае апісаньне таго бюрократычнага шляху, па якому праходзіў гэты цікавы экспонат.



Людзі ўсе пішуць і пішуць, а слупы... што слупы? Яны гнуцца.

Заразіліся бюрократычнай хваробай

(м-ка Астрашыцкі-Гарадок, Меншчына)

У нашым мястэчку маецца Народны дом, у якім працуюць загадчык і бібліотэкар.

Вось пры гэтым самым Нардоме існуе даведчае бюро, якое дае ўсякія спраўкі, саветы і піша заявы сялянам, якія зьвяртаюцца да яго за тэй ці іншай радай.

На першы погляд справа добрая, трэба толькі дзякаваць. Але бяда у тым, што таварышы, якія працуюць у гэтым самым бюро, у апошні час абюракраціліся. Калі які-небудзь дзядзька зварачваецца да бібліотэкара або загадчыка з просьбай напісаць заяву, яны перш на перш яго пытаюць:

— А Вы, дзядзька, адкуль?

— З Прылепскага с-с.

— Дык Вам трэба зьвярнуцца да загадчыка хаты-чытальні, якая ў Вас ёсьць. Няхай ён і напіша.

Селяніну, які цягнуўся якіх-небудзь 15 вёрст па справам ў раённыя ўстановы, прыходзіцца зварочвацца да сваёй хаты-чытальні, альбо ісьці да прыватнага абаронцу.

Адпаведным установам трэба рэагіраваць на такое зьявішча.

Буралом.

„Цуда" протэкцыянізму.

Ну хто паверыць, што прыказчыца коопэратыву таксама можа зрабіць якую-небудзь протэкцыю? А вось гэтымі днямі прышлося бачыць такое «цуда».

Парашыў я купіць сабе бязі на бялізну. Прышоў у краму ЦРК № 25, што знаходзіцца на рагу Савецкай і Комсамольскай. Зьвярнуўся да прыказчыцы:

— Ці ёсьць у вас бязь?

— Не, няма.

Няма, дык няма. Адышоў у старонку і думаю: што рабіць, што купіць. Тым часам гляджу як паявілася бязь над прылаўкам... Прыказчыца адмерыла 6 мэтраў і бязь зноў згінула пад прылаўкам. Праз некаторы час гэта зноў паўтарылася.

Парашыў даведацца ў чым справа.

— Вы, магчыма, памыліліся,—зьвярнуўся я зноў да прыказчыцы.—Я бачыў у вас бязь.

У адказ па мяне крыкнулі:

— Адвяжыцеся. Ня ваша справа.

А праз некаторы час зноў з пад прылаўка зьявілася бязь, зноў згінула.

Справа тлумачыцца вельмі проста. Бязь цяпер дастаць цяжка і прыказчыца **Бейлінсон** з крамы МЦРК № 25 парашыла аддаваць яе толькі сваім знаёмым.

Так зьвяршылася «цуда» протэкцыянізму.

Мік.

У ліпені месяцы ў „Чырвонай Зьмене" будзе зьмешчана старонка, прысьвечаная пытаньням бюрократызму ў комсамольскай організацыі.

Рэдакцыя зварочваецца да юнкораў з просьбай пасьпяшыць з прысылкай матар'ялаў.

Да ведама экскурсантаў.

Экскурсійныя ГРУПЫ моладзі, едучыя ў экскурсію Ў ЛІПЕНІ МЕСЯЦЫ і жадаючыя атрымаць ільготны праезд (50—проц. скідка) па чыгунцы, павінны накіраваць свае заявы ў адрас экскурсійнай камісіі газэты „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА" (Менск, Комсамольская 25).

Пры атрыманьні заявы экскурсійная камісія будзе хадайнічаць перад адпаведнымі ўстановамі аб атрыманьні патрэбнай колькасьці ліцераў.

У прысылаемых заяўках павінны быць ясна і дакладна паказана: склад групы (прозьвішча, імя, узрост, соцыяльнае становішча, партыйнасьць, дзе працуе, служыць ці вучыцца, ці ўдзельнічаў раней у экскурсіях і якіх), куды едзе група, час ад'езду і працяжнасьць экскурсіі.

Заявы прымаюцца ТОЛЬКІ ГРУПАМІ.

Экскурсійная Камісія газэты „Чырвоная Зьмена".

Застаўся сьлед...

Прагрымеў выстрэл і кулька, прабіўшы трэцяе чорнае кола, намалёванае на лісьце паперы, упілася у дошку. У ціры пачуліся гукі адабрэньня, здаволенага сьмеху:

— Папаў, ага!

— Ня хібіў, такі!

Ашчасьліўлены стралец адыходзіць у бок. Бярэцца другі. Усе насторожана паглядаюць то на мушку, то на колы праведзеныя на паперы, то на зажмуранае вока стральца.

Выстрэл.

— За малаком пашла.

— І сьледу нат' не пакінула.

—З яго браце, стралец, як з майго дзеду рыбалоў.

— Дармо, паправіцца.

— Вось той першы—як стрэліць, то сьлед застанецца, стралец добры будзе.

—

У ячэйку (назву вам і ведаць не надта цікава-такіх ячэек шмат) прышла паперка з райкому аб організацыі гуртку садзейнічаньня ТСААвіяхіму. Сход, дзе разбіралася гэта паперка, быў шумным і бязумоўна поўны энтузыязму. Рэзолюцыя была складзена баявая і красамоўная. Пасьля такіх рэзолюцый адразу бярэ ахвота запісацца у гурток, хадзіць на яго заняткі, працаваць да сёмага поту.

У нас шмат майстроў складаць рэзолюцыі. Як выносяць яе, хвалююцца, быццам блізкага пакойніка выносяць, а як вынеслі—і забылі. Тут яшчэ настрой зьмянілі другія паперы з райкому: трэба-ж да кожнай прыглядзецца, і такую-сякую рэзолюцыю ўтварыць, адным словам пра тую паперу і справу, забылі.

Засталося ўсё на паперы, у каракулях выведзеных шчырым сэкратаром сходу.

Сьлед застаўся толькі на паперы...

—

Ведаў я аднаго селяніна. Чалавек шустры і надта ўсякімі тэхнічнымі прыладамі цікавіўся: убачыць малатарню новага тыпу, абавязкова прыгледзіць і пастараецца зрабіць такую самую; самалёты сталі за сялом, ухітрыўся прасачыць і бадай з месяц длубаўся ля стала, каб скласьці самалёт.

І пасьцігла неяк яго няшчасьце.

Ішоў па сенажаці і ў кусьце выпадкова прыкмеціў бліскучае нешта: аказалася граната. Палякі адступаючы шмат іх пакінулі.

Спачатку баяўся чапаць, але жаданьне паглядзець як зроблена ўзяло верх.

Узяў, крыху падкруціў, пацісную недзе... і застаўся бяз рук.

Лячыўся месяцаў шэсьць (адна рука канчаткова скалечана).

Цяпер апавядаючы аб гэтым, заўсёды дадае:—Ня трэба было браць, ня ведаючы гэтай халеры.

Яго сын комсамолец (у вайсковы гурток у мястэчка ходзіць).

Бацька на заняткі яго з ахвотаю адпускае.

—Ідзі, я сам папар паскароджу, упраўлюся неяк, хаця з рукою хворай. Мне ўжо добры сьлед дадзены ад маёй несьвядомасьці. Кроўю заплаціў. Трэба ведаць, за што і як брацца.

Макс.

Страляць будзем метка.

Без ваенных ведаў, без уменьня ўладаць вінтоўкай мы ня зможам умацаваць нашу абароназдольнасьць.—Абучайся ў стралковым гуртку, узбройвай сябе вайсковымі ведамі.

Кожны комсамолец--стралок
Кожная комсамолка--санітарка

Чэрвеньская комсамольская організацыя мае шэраг посьпехаў ў вайсковай працы

(Гутарка з адказным сэкратаром Чэрвеньскага РК ЛКСМБ тав. Каласоўскім).

Цяпер наша комсамолія вельмі цікавіцца вайсковай працай. Зьвязана гэта з умовамі нашай мясцовасьці і з тым, што наша організацыя павялічыла свае шэрагі галоўным чынам у пэрыод 1921-25 году, ў пэрыод бандытызму і бандыцкіх налётаў. Вайсковы дух у нашай організацыі зьяўляецца быццам-бы традыцыяй. У апошнія часы вайсковая праца ў організацыі ажывілася ў сувязі з апошнімі здарэньнямі.

Улічваючы настрой комсамольскай масы, мы на чэрвеньскім пленуме РК абгаварылі пытаньне аб узмацненьні вайсковай працы ў організацыі.

З удзелам прадстаўнікоў вайсковых частак была распрацавана програма працы баявой адзінкі, якую парашылі організаваць ў горадзе.

Гэтая баявая адзінка ўжо створана. Уся гарадзкая організацыя падзяляецца на **пяць взводаў, у якія уваходзяць 100 проц. комсамольцаў.** 4 узводы стралковых і адзін кулямётны. Пры чым, з дзяўчат створана рабочая каманда сувязі, і санітарная каманда. Асноўным у працы мы палажылі вінтоўку, процівагаз, гранату, тэлефон.

Праграма каманды разьлічана на 72 гадзіны. Заняткі праводзяцца тры разы ў тыдзень. Але і пасьля гэтага тэрміну каманда ня спыніць свае працы.

Да сённяшняга дню мы мелі добрае наведваньне вайсквоых заняткаў. Мы ўвелі ўсе элемэнты ваеннай дыцыпліны ў нашу працу. Ужо закончылі вывучэньне вінтоўкі, закончылі наводку. Вынікі—добрыя. Хлапцы ўжо правільна бяруць прыцэл.

У сувязі з гэтым агульная дысцыпліна ў гарадзкой організацыі паднялася.

Палепшылася наведваньне сходаў ячэек.

Умацавалі сувязь і заахвоцілі ваеннай справай

(Ячэйка НКЮ, Менск)

26-го чэрвеня, у нядзелю, па ініцыятыве нашай комсамольскай ячэйкі была праведзена прагулка з сатаварыскай ваеннай групай у лес за горад. Разам з комсамольцамі і чырвонаармейцамі прынялі ўдзел у гэтай прагулцы шмат партыйцаў і беспартыйных-курсантаў юрыдычных курсаў пры Наркамюсьце. Ня гледзячы на сьпякоту, усе комсамольцы, акуратна, у вызначаны час раніцою сабраліся і пашлі да казармаў нашых вайскоўцаў.

Там сеўшы вярхом на коней, а дзяўчат пасадзіўшы ў павозкі, мы паехалі ў лес.

У лесе выбралі добрае месца, дзе наладзілі гульні, футбол і інш. спартыўныя выступленьні. Адчувалася адна сям'я. Усе разам гулялі, сьпявалі, сьмяяліся.

Пасьля гэтай «вясёлай часткі» удзельнікі прагулкі выслухалі лекцыю сьвязіста-комсамольца аб сродках сувязі ў арміі, у прыватнасьці аб пабудове тэлефону. На сканчэньні лекцыі былі праведзены практычныя заняткі па правядзеньню тэлефоннай лініі.

Усе з ахвотаю і з вялікай цікавасьцю ўзяліся за гэтую справу і праз кароткі час месца нашай прагулкі было злучана з бліжэйшым хутарам. І вось:

— Алё!.. Алё!.. Васька, чуеш? Мы на хутары... шмат вады, ворага ня відаць... Прышлеце бутэлькі за вадою.

Сяляне былі зьдзіўлены хуткасьцю пракладкі тэлефоннай лініі ад месца нашай стаянкі да іхняга хутару.

Гульні, катаньне вярхом на конях і практычная пракладка тэлефону пакінулі ў нас вельмі добрыя ўражаньні, замацавалі яшчэ больш сяброўскую сувязь з ваеннай часткай і зацікавілі прысутных ваеннай справай.

Х. Лісток.

Будзем умець уладаць зброяй

(М-ка Астрашыцкі Гарадок, Меншчына)

Увесь час у нашай ячэйцы ня было працы па ваенізацыі. Колькі не гаварылі, колькі ня пісалі, а справа—ні з месца. Цяпер-жа пасьля дакладу аб сучасным міжнародным становішчы было ў першую чаргу высунута пытаньне аб вайсковым гуртку. Гэтае пытаньне паўстала перад намі ва ўсю шыр і знайшло сваё практычнае ажыцьцяўленьне. Організавалі гурток з усіх комсамольцаў і распачалі працу.

Заняткі. нашага ваеннага гуртку праводзяцца два разы ў тыдзень па 2 гадзіны. Вывучаем строй, стрэльбу і г. д.

Пасьля некалькіх заняткаў мы правялі травогу. Роўна праз 10 хвілін пасьля першага сыгналю, а 1-ай гадзіне ночы сабраліся ўсе комсамольцы, а гэтага раней і чакаць-бы ня прышлося.

У якасьці кіраўніка ваенным гуртком намі запрошаны пераменьнік, які добра ведае вайсковую справу. Гурткоўцы з ахвотаю і акуратна наведваюць заняткі, з цікавасьцю слухаюць кіраўніка.

Покуль што аб дасягненьнях гаварыць цяжка, але калі судзіць па цяперашняму ходу заняткаў, дык трэба спадзявацца на добрыя вынікі.

Хв. Смарговіч.

Асушым балоты.

Заваюем новыя дзялянкі зямлі.

Ратуем землі

(Ямніцкі сельсавет, Быхаўскі р.. Магілеўшчына)

Вёскі Ямніцкага сельсавету, іх суглінавыя глебы, акружаны прысадзістымі, няпрыгожымі на выгляд сасонкамі, за плячыма якіх markрознымі выкрутасамі цягнуцца зарослыя багуном мохавыя балоты.

На колькі-б тысяч дзесяцін пашыралася засеўная плошча Ямніцкіх вёсак, каб балоты выцягці з іх векавой гразі!?

І гэта зразумелі комсамольцы **Ямніцкай** ячэйкі. Іх праца і накіравана на выклікаьне ў сялян зацікаўленасьці да справы мэліорацыі.

Па ініцыятыве комсамольцаў, дзякуючы іх напружанай працы, утварылася **Колетнянскае** мэліорацыйнае таварыства, старшынёй якога—комсамолец **Ефімаў В.** Сёньня таварыства налічвае 44 сяброў. За паўтара гады працы **раскарчавана 60 дзесяцін балота. З іх 30 дзесяцін** раскарчована на чыста і ў гэтым годзе засеены вікай і ленам-даўганцом.

Таварыства ў запасе мае 30 пуд аўсу. На бягучым рахунку ляжыць 30 р., ды на руках таварыства рублёў 40. За ўсё гэтыя сродкі мэліорацыйнае таварыства зьбіраецца купіць якую-небудзь машыну для апрацоўкі балота.

У гэтым годзе таксама закладаецца **паказальны вучастак.** Для раскарчоўкі вызначана новых 32 дзесяціны балота.

Усё таварыства вельмі зацікаўлена ў справе мэліорацыі, а таму ўсім сходам і абгаварваюцца мерапрыемствы таварыства, нават і самыя дробныя.

Зьмі.

Будзе чым паліць, будзе на чым і сеяць

Кожныя заняткі гуртку, кожны сход, культдзень ці нарада, што праводзіліся нашай ячэйкай, абрываліся ў самым разгары і канчаліся сваркаю аб дрывах.

--- Усяроўна, казалі сяляне, калі не дадуць дроў, то заўтра-ж паедзем валіць Станькаўскую дачу бяз ніякага на гэта дазволу.

І ўзялася за вырашэньне гэтага пытаньня комсамольская ячэйка. Правяла шырокую гутарку на тэму **«Бяздроўе! і як яго зьнішчыць шляхам распрацоўкі торфу“.**

Спачатку сяляне катэгарычна протэставалі, кажучы:

--- Ведаем, як вы паліце торфам у Вільшчыне, дык да нас 5-ць кілёмэтраў, а раніцою, як выйдзеш на двор, хоць нос затыкай.

Але інакшага выхаду ня было і сяляне згадзіліся.

Зараз яны ўжо пачалі крычаць іншым тонам:

--- Пішэце нас у таварыства!

Ячэйка не адцягвала і зараз-жа склікала сход сялян, на якім усе сяляне—45 чалавек—становяцца сябрамі торфянога таварыства.

У таварыства ўвашлі і тыкія беднякі, якія грашовага паю увесьці ня могуць. Ім дазволілі адпрацаваць пай на балоце.

Цяпер закіпела праца на балоце, заблішчэлі чорныя крыжыкі брускаванага торфу...

-- Мы яшчэ, -- кажуць сяляне,-- як казаў той «торф-майстра», увесь скопаны кавалак засеем кармавым травамі, сена будзем мець.

Паграмок Ул.

Новыя справы, новыя людзі...

(Вёска Аголіцы, Мазырская акруга).

Лес, балоты, пяскі.

У парасьлях, ціне, у зеляніве, аеру і чароту захавалася рэчка **Бобрыч.**

Рэчка няглыбокая, вузкая, шпарка бяжыць вада, надкрашаная балотным жабурыньнем.

І аголіцкая моладзь парашыла скарыстаць яе для асушэньня сваёй зямлі: **зрабіць гэту рэчку вадапрыёмнікам.**

Большасьць аголіцкіх сялян—беднякі: паўтары-дзьве дзесяціны кепскай зямлі, зусім мала жывёлы. Добра, што лесапільны завод блізка; ходзяць у заработкі.

І калі моладзь, комсамольцы загаварылі аб **мэліорацыі**, аб **асушцы балот**, што колам аблягаюць вёску **Аголіцы**, сяляне хутка зразумелі карысьць гэтай справы і далі сваю згоду.

Было створана мэліорацыйнае таварыства. **212 двароў—209 сяброў таварыства.**

Выбралі праўленьне, рэвізыйную камісію.

Галоўныя працаўнікі, кіраўнікі таварыства — маладыя хлопцы. Старшыня праўленьня—дэмобілізаваны чырвонаармеец. Старшыня рэўкамісіі—комсамолец, настаўнік.

І працуе праўленьне па маладому, панавому.

Сваімі сіламі сяляне праводзяць каналы на працягу 8-мі вёрст. Дапамагаюць селянікам у адшуканьні магчымасьцяў больш карыснай мэліорацыі.

Раніцай, выходзіць чарада працаўнікоў, пераважна моладзь, з лапатамі на месцы пракопкі канаў, рэгуляваньня ракі.

І ня толькі сяляне балота асушаюць, а ўводзяць і культуру ў сваёй гаспадарцы. Многія гаспадары **кормяць жывёлу па норме, абавязкова ачышчаюць насеньне перад пасевам.**

Пашыраюць свае гаспадарчыя веды ў с.-г. гуртку, які ахоплівае 30 чалавек.

Узяў гурток кавалак самай кепскай зямлі. Заклаў паказальны вучастак. Расьце ўсё лепш, чым на гародах вёскі.

Аголіцкія сяляне—энэргічныя працаўнікі

З запалам працуюць і вераць у перамогу.

А. Ф.



Да ўсіх комсамольцаў Белдзяржуніверсытэту, знаходзячымся на вакацыях

Паважаныя таварышы!

Зараз праводзіцца пяцітыднёвік «Чырвонай Зьмены».

Газэта «Чырвоная Зьмена» зьяўляецца ворганам, адбіваючым колектыўную думку, жыцьцё і працу комсамолу і рабоча-сялянскай моладзі Беларусі.

«Чырвоная Зьмена» адбівае ўдзел комсамолу ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве Беларускае Рэспублікі. Але да гэтага часу «Чырвоная Зьмена» ня досыць шырока распаўсюджава сярод комсамолу і рабоча-сялянскай моладзі; трэба, каб кожны комсамолец, пачынаючы ад актывістага і канчаючы радавым, чытаў і выпісваў «Чырвоную Зьмену».

Праводзімая кампанія павінна прайсьці пры актыўным удзеле комсамольцаву зоўца. Ячэйка праводзіць шэраг практычных мерапрыемстваў па падняцьцю тыражу газэты і зьвяртаецца да Вас прыняць таксама актыўны ўдзел у праводзімай кампаніі. Кожны з Вас павінен актыўна дапамагаць комсамольскім ячэйкам на мясцох: 1) у папулярызацыі «Чырвонай Зьмены» сярод комсамольцаў і рабоча-сялянскай моладзі (правядзеньне чытак, дакладаў, судоў і г. д.), 2) у скліку юнкораўскіх нарад з абгаварэньнем пытаньняў удзелу ў працы «Чырвонай Зьмены» і яе распаўсюджваньні, 3) у шырокай вярбоўцы дапішчыкаў на газэту «Чырвоная Зьмена» і 4) у шырокім высьвятленьні ходу і вынікаў кампаніі ў «Чырвонай Зьмене».

Па прыезьдзе з вакацыяў кожны з Вас павінен будзе паведаміць ячэйку аб праведзенай ў гэтай галіне працы.

З комсамольскім прывітаньнем
Бюро ячэйкі ЛКСМБ БДУ

На шэсьць месяцаў

Кампанія пяцітыднёвіка «Чырвонай Зьмены» у Акцябрскім райкоме некалькі спазьнілася. Але цяпер праца па распаўсюджваньню «Чырвонай Зьмены» пачала пашырацца. Пытаньне абгаварваецца на агульных сходах ячэек, пасяджэньнях бюро і ўжо абгаварвалася на пашыраным пленуме РК ЛКСМБ.

Выступаючыя ў спрэчках таварышы перш за ўсё адзначалі:

— Мы да гэтага часу не звярочвалі ўвагі на сваю газэту, не прапагандавалі яе ў гушчу комсамоліі.

Побач з гэтым азначалі, што распаўсюджваньне „Чырвонай Зьмены“ залежыць і ад самой рэдакцыі. Неабходна пашырыць аддзел міжнародных падзей, у якім зьмяшчаліся часткі праграмы з спазьненьнем.

Хлапцы давалі таксама дзельныя прапановы, як напрыклад:

--- Зрабіць пашыраную рэдакцыю па прыкладу маскоўскай «Рабочай Газэты».

--- Зьмяшчаць тыднёвыя агляды міжнароднага становішча.

--- Прыстасаваць газэту як да таварышоў першай, так і другой катэгорыі політ-адукацыі.

Пленум РК вынес пастанову, каб **усе сябры РК, а таксама сябры бюро ячэек выпісалі абавязкова „Чырвоную Зьмену“** на 6 месяцаў. Ячэйкам прапанована правесьці шэраг мэрапрыемстваў, прысьвечаных пяцітыднёвіку.

Акцябрка дырэктыву ЦК ЛКСМБ **аб** пяцітыднёвіку «Чырвонай Зьмены» выконвае.

А. Г.

Коратка і ясна

(в. Коўбчы, Каўбчанскага с.-с, Клічаўскага раёну)

У сувязі з пяцітыднёвікам «Чырвонай Зьмены» у нас быў праведзены сход комсамольскай ячэйкі, на якім быў зроблен даклад аб пашырэньні падпіскі на «Чырвоную Зьмену».

Пастанова, якую мы вынесьлі, была кароткай:

— Ніводнага комсамольца не павінна быць, які-б ня выпісваў «Чырвоную Зьмену».

— Кожны комсамолец павінен быць распаўсюджвацелем „Чырвонай Зьмены“ сярод моладзі.

Кніга.

Улетку растаяла падпіска

(Бялынкаўшчына, Магілеўскай акругі)

З наступленьнем лета колькасьць падпісчыкаў «Чырвонай Зьмены» панізілася да 10. Гэта тлумачыцца тым, што комсамольскія ячэйкі Бялынкаўшчыны перасталі зьвяртаць увагу на падпіску газэт.

Упаўнаважаныя друку таксама не працуюць.

Касьцюкавіцкаму РК ЛКСМБ неабходна прабудзіць комсамольскія ячэйкі і ячэйковых упаўнаважаных.

Р. Бяздольны.

Абавязкова выпісаць

Рашэньні аб абавязковай выпісцы ўсімі комсамольцамі „Чырвонай Зьмены“ вынесены на агульных сходах ячэек фармацэўтычнага заводу, банкаў, першай дзяржрукарні, працколектыву „Чырвоны Ткач“ і акрстрайкому.

Хто за ножкі, хто за рожкі...

(Мэліорацыйныя).

Хто за ножкі,
Хто за рожкі
Цягнуць быка грамадой.

А бык сівы,
Ды бяз сілы
Акалеўшы ў вадзе

Ўжо ня раўецца,
А трасецца,
Ляжыць, мыкае, ныйдзе...

Ўсе як чэрці,
Аднэй шэрсьці
Абмараліся ў гразь.

Цягнуць, цягнуць
Самі гразнуць
А ня выцягнуць ў раз...

Плача горка,
Наш Рыгорка
Льлюцца сьлёзы, што ў бабра,

— Людзі, людзі
А што-ж будзе?...
Ай, няма, няма дабра...

Ганна, кажа,
— Доля наша
Вось дык маю шмат бяды,

Эх, у бога
Мы нічога
Так няварты ніжуды—

* * *

Што вы людзі,
Досыць будзе,
Горка плакаць гараваць

І за ножкі
І за рожкі
Нам жывёлу так цягаць.

Эй сяло ты
Ўсё балота,
Распрацуй-жа, асушай

Схамяніся
Агляніся
У гразі незагінай!

Мы малойцы
Комсамольцы
Будзем першыя за ўсіх

І за працу
Сьмела хлопцы,
Лоўка возьмемся ў міг!

Зах. Бульбянік.



Туды дзе чыстая паветра

Менскія піонэры ў лягэры

У хваёвым лесе

(Піонэрскі лягер Акцябрскага раёну ў Курасоўшчыне)

Хваёвы лес на ўзгор'і не дазваляе думаць аб прысутнасьці там піонэрскага лягеру, калі едзеш у Курасоўшчыну па дарозе з Менску. Але трэба толькі пад'ехаць бліжэй, як пачуеш гукі горну, вясёлыя дзіцячыя выклікі і сьпевы. І калі ўзбярэцца на ўзгор'е, можна ўбачыць дзяцей у піонэрскай вопратцы і чырвоных хустках.

У сярэдзіне паміж уваходам у лягер і памяшканьнем курасоўшчынскай школы—вялікая бразэнтавая палатка і мачта. На мачце—чырвоны сьцяг і ля яе дзяжурны піонэр.

Навакол вялікая расчышчаная пляцоўка, на якой бегаюць піонэры, гуляюць у мяч, эстафэту і інш.

А 7-й гадзіне падымаюцца. Зараз-жа фізкультура і купаньне. Потым гарбата, прыбраньне памяшканьня, праца па лягеру...

У 11 гадзін сонечныя ванны і зноў купаньне.

У 9 гадзін ўвечары—фізкультура і апошняе купаньне.

Акрамя гэтага ёсьць абавязковая пастанова рады аб тым, каб піонэры хадзілі ў трусіках або шараварах, і для хлапцоў абавязкова бяз верхняй рубашкі. Доўгія штаны і спадніцы—забаронены.

У першыя дні

Дысцыпліна ў лягеры строгая.

Рада ўхваліла прымяніць да парушыўшых дысцыпліну «вышэйшую меру кары»—высылку з лягеру. У адказ піонэры папрасілі выбачэньня на сходзе лягеру і справа закончылася сьлязьмі. А «вышэйшая мера» была пакінута ўмоўнай.

Быў і другі цікавы выпадак. Настаўнік курасоўшчынскай школы напіўся водкі і ў п'яным выглядзе зьявіўся ў лягер.

-- Эй, піонэры!--закрычаў ён.--Зараз-жа ўбярэце свае цацкі, а то пакалачу.

Піонэры «свае цацкі» не ўбралі, і п'яны настаўнік разразіўся сэрыяй трохпавярховага мату. Старэйшыя піонэры толькі пасьмяяліся, а малодшыя гаварыць:--так напужаліся, што ноччу ня спалі.

На другі дзень, калі піонэры сьнедалі, ў дзьверы нехта пастукаў, пасьля чаго ў іх паказаўся знаёмы настаўнік.

-- Таварышы піонэры! Выбачайце! больш ня буду. З п'янага вока аб зьмене нашай забыў... Пакрыўдзіў... Прабачайце...

Піонэры агітнулі за зьмену, ну, і потым... «прабачылі».

Сонца, паветра, вада.

Лягер ня будзе лягерам, калі ў ім ня будзе строгага распарадку дню. Гэтай думкі трымаецца рада лягеру. Усё жыцьцё ідзе ў строгім парадку.

У цэнтры распарадку—мэта—выкарыстаць сонца, паветру ваду.

Будзе новы атрад.

Цэнтральнае месца ў распарадку дню займаюць працы: трудавая (па абсталяваньню лягеру) і праца з неорганізаванымі дзяцьмі (ад працы сярод дарослага сялянскага насельніцтва лягер адмовіўся, замест чаго парашыў павесьці яе сярод сялянскіх дзяцей).

Кожны вечар, калі канчаюцца палявыя працы, сялянскія дзеці ідуць да піонэраў. Гуляюць, прысутнічаюць на зьвеньнявых сходах, слухаюць гутаркі... Ад 6 да 8 гадзін увечары піонэры спэцыяльна займаюцца з сялянскай дзетвара й, тлумачаць ім законы і звычаі юных піонэраў, праводзяць розныя гутаркі і г. д.

-- Будзе новы атрад,--кажуць піонэры.

* * *

Уся праца ў лягеры вядзецца па зьвеньням. Існуюць гаспадарчае зьвяно, трудавое, культурнае і г. д. З «шамоўкай» пакуль ніякіх непаразуменьняў ня было. Усе піонэры сыты--ядуць 4 разы ў дзень. Саўхоз чугуначнікаў адпушчае штодзённа 15 літраў малака--так, што ў гэтым таксама недастачы няма.

Кожнае зьвяно вядзе дзеньнік аб сваёй працы. І калі ў сваім дзеньніку культзьвяно піша аб цяжкасьцях пры організацыі чытальні, дык у дзеньніке гаспад. зьвяна можна прачытаць: «Адпушчана на абед 10 фунтаў мяса, 10 літраў малака» і інш.

Мікола.



За соцыялістычную рацыяналізацыю

Па прапанове комсамольцаў.

(Мясцком пуці і матар'яльнай, Менск, МББч).

Маладых чыгуначнікаў налічваецца 46 чалавек, з іх—11 комсамольцаў. У вытворчасьці комсамольцы прымаюць актыўны ўдзел. Вось, напрыклад, на апошняй вытворчай нарадзе пры мясцкоме прысутнічала 9 комсамольцаў.

Што практычна зрабіла вытворчая камісія і нарада пры мясцкоме?

— Раней у кузьні пуці працавалі ручным способам.

Кузьня з працай не спраўлялася. Аддавалі вялікую частку працы ў іншыя кузьні. Па пастанове вытворчай нарады ў кузьні была праведзена мэханізацыя: устанавілі болтарэзныя, сьвярлільныя і іншыя варштаты.

Па прапанове комсамольца ў кузьні была зроблена труба, з прычыны адсутнічаньня якой раней дым у кузьні зьбіраўся цэлымі хмарамі.

Вытворчая нарада высунула пытаньне аб адчыненьні вучастковай кладавой, пасьля чаго была значна ўпрошчана сыстэма атрыманьня матар'ялу для працы. Да гэтага матар'ял знаходзіўся на вялікай аддегласьці у матар'яльным складзе і каб яго дастаць, кожны раз прыходзілася пісаць спэцыяльную паперку і губляць шмат дарэмнага часу.

На рамонце пуці была ўведзена аккупная*) сыстэма працы, дзякуючы чаму зараз прыходзіцца менш наймаць падсобнай сілы. Гэта-ж мерапрыемства дало павялічэньне вытворчасьці працы на 60 проц.

Ня было на чыгунцы асобнага шляху для перавозкі матар'ялу. Езьдзілі па лініі, псавалі шпалы. Па прапанове **комсамольца Мінкевіча** быў пабудаван новы шлях.

Па прапанове іншага комсамольца кожнай рабочай арцелі на пуці далі па вагончыку, неабходнаму для працы. Да гэтага на ўсе арцелі меўся адзін толькі вагончык і для атрыманьня яго арцелі прыходзілася чакаць шмат часу, покуль скончаць працу іншыя.

Чыгуначнік.

*) Гэта значыць—рабочаму даецца вызначанае заданьне, за якое ён атрымлівае вызначаную плату. У выпадку дрэннай працы ці іншых здарэньняў, заданьне не прымаецца.

У маладых будаўнікоў

(На будаўнічых работах у Менску)

На пабудове 4-х павярховага дому па Ленінскай вуліцы працуюць каля 140 рабочых, з іх—35 маладых. Ёсьць тут і комсамольцы, каля 15 чалавек.

Хлапцы, добра ведаючы аб рацыяналізацыі, надумалі і ў сябе правесьці што небудзь.

-- Наша праца простая, але і мы маем некаторыя дасягненьні. Вось прыклады:

Пясок і каменьні, якія нам прывозяць, ня сыплюцца куды папала, а ў асобна зробленыя скрынкі.

Ваду, якую мы раней таскалі вёдрамі мы цяпер таксама «рацыяналізавалі»: зрабілі насосы да месца аблiўкі.

Раней палівaў бочкі асобны рабочы. Хлапцы зразумелі, што ён лішні чалавек, абгаварылі пытаньне з кім належыць і тут правялі рацыяналізацыю: рабочаму далі іншую працу, а замест чалавека цяпер працуюць насосы.

-- А ці патрэбны насосам жывыя людзі?

Раней, каб спускацца з рыштаваньняў, была зроблена земляная драбіна, па якой надта дрэнна было ісьці. Хлапцы настаялі на тым, каб зрабіць драўляныя масткі. Выгады ад гэтага вялікія.


Так пры ўдзеле комсамольцаў мы змаглі зрабіць некаторыя дасягненьні ў справе рацыяналізацыі.

Галубок

Як яны „праводзяць рацыяналізацыю".

Яшчэ ня ўсюды ў нас лёзунг рацыяналізацыі разумеецца правільна. Ня рэдка пад выглядам рацыяналізацыі, спрабуюць правесьці непатрэбныя і шкодныя „упрашчэньні" і скарачэньні, толькі перашкаджаючыя агульнай справе.

(З газэт)



Ці ня сорамна?

(М. Талочын, Аршанскай акругі)

Нядаўна на сходзе рабочых працколектыву гарбароў загадчык колектыву сароміў нашых комсамольцаў. Апошнія ніколі ня слухаюцца свайго майстра.

І гэтак заўсёды пры разьмеркаваньні працы бываюць спрэчкі паміж комсамольцамі і старшымі майстрамі.

Дрэнна адносяцца комсамольцы і да сваёй працы.

-- «Можна сказаць, не працуюць--кажа загадчык--а толькі глумяць: абробіць апоек, дык ён увесь у дзірках, сапсуе палувал і ніхто гэтага тавару ня хоча купляць. Адразу відна праца комсамольцаў. Яна «адрозьніваецца ад працы іншых рабочых».

І ці ня сорамна гэтак працаваць?

Ячэйцы трэба гэтым пытаньнем заняцца.

Зак.

Справы і дні Задубскай ячэйкі.

Задубская ячэйка ЛКСМБ, Кармянскага раёну, Магілеўскай акругі, прэміраваная на акруговым конкурсе вясковых ячэек першай прэміяй, здолела практычна знайсьці способы ўвязкі асабістай зацікаўленасьці комсамольцаў у палепшаньні сваёй гаспадаркі з агульнымі задачамі соцыялістычнага будаўніцтва. Каб даць організацыі і ячэйкам нашага саюзу малюнак, як практычна можна выращаць гэту цяжкую задачу дню, рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" зрабіла агляд працы прэміраванай ячэйкі. Друкуемы матар'ял агляду павінен зьявіцца ўзорам---як трэба працаваць комсамольскім ячэйкам у вёсцы.

Тактыка і стратэгія, або малочная гаспадарка

І комсамольская ячэйка і сельска-гаспадарчае таварыства імя Чарвякова як аснову ўсяе далейшае працы ставіць **задачу ўтварэньня пры таварыстве малочнай гаспадаркі.**

Чым гэта выклікана?

Сельскай гаспадарцы Беларусі наогул прыдаецца **жывёлагадоўчы ўхіл.** У



прыватнасьці, прад Кармянскім раёнам гэта задача настаўлена **ва ўсю шырыню сёньняшняга дню.** Гэта першае. Другое: уклад жыцьця задубцаў больш за ўсё набліжаецца да мінулага часу, калі жыхары «выпрацоўвалі» амаль усё тое, што ім неабходна для пражыцьця. Задубскі селянін ніколі ня мае грошы, бо няма збыту для яго прадуктаў сельскай гаспадаркі. Гаспадары проста скардзяцца: — **Скалані ўсю вёску і пасёлкі і наўрат ці знойдзеш у каго капейку.**

Вось **прыблізіць для задубцаў рынак збыту на іх сельска-гаспадарчыя прадукты, а разам з гэтым зрабіць сялянскую гаспадарку больш інтэнсыўнай, больш прыбытковай**—другая прычына, што паставіла і прад ячэйкай і прад таварыствам пытаньне організацыі малочнай гаспадаркі.

— **Будзе створана малочная гаспадарка пры таварыстве,**—гадае ячэйка, — **адчыніцца для сялян збыт лішняга малака.** А збыт лішні малака і атрыманьне за яго у гаспадарку добрага прыбытку штурхане гаспадароў на палепшаньне свае жывёлы. Каб палепшыць жывёлу, трэба мець шмат добраякаснага корму. І можна ўпэўнена сказаць што калі селянін зацікавіцца палепшаньнем сваіх кароў, калі для гэтага ён будзе мець рацыю--ён ужыве усё ад яго залежнае, каб набыць ім добры корм. Такім кормам будзе: **корняплоды і травасеяньне.** Значыць, **пашырэньне жывёлагадоўлі ёсьць павялічэньне засеву корняплодаў і кармовых траў—павялічэньне інтэнсіфікацыі гаспадаркі.**

Задача стварэньня малочнай гаспадаркі моцна засела ў галовах комсамольцаў і ячэйка ад яе неадступіць ні на крок.

Па праўдзе сказаць, дык організацыя сельска-гаспадарчага таварыства і палепшаньне комсамольцамі сваіх гаспадарак—гэта ні больш-ні менш, як **тактыка** да разьвязаньня **стратэгіі—організацыі малочнай гаспадаркі.**

Нашы магчымасьці

І млын і сады, таварыства прымушае служыць **падрыхтоўцы да організацыі малочнай гаспадаркі.**

Атрыманыя **тысячу рублёў** за сады—будуць поўнасьцю страчаны на куплю добрай пароды, прыбытковай у нашай мясцовасьці, кароў. Нястачу срэдкаў таварыства думае атрымаць крэдытам у Магілеўскім Акрсельсаюзе.

Адчыненьне малочнай гаспадаркі намячаецца ўвосень гэтага году.

А як будзе з кормам?

Для кароў таварыства кормам забясьпечана.

Старагродзкі млын увесь час **зьбірае** вотрубі і субар (зьмесь аўсу, ячменю, мукі). **Засееныя 60 пудоў вікі на плошчы двух садоў дадуць ня менш тысячу пудоў добрага сена.** Таксама таварыства думае і аб **жмыхох.** Для гэтага купляецца **алейня,** якая будзе працаваць пры млыне: **сяляне будуць мець алей, а таварыства жмыхі для корму.**

„Дзіцё ячэйкі"

Калі заходзіць гутарка аб таварыстве, ячэйка з вялікай упэўненасьцю ў правільнасьць гэтага з гонарам даводзіць:

— **Сельска-гаспадарчае таварыства імя Чарвякова — гэта наша дзіцё, гэта сьведка нашай практычнай працы.**

Слухаючы гэтыя словы, сяляне-беднякі, сябры таварыства, ня могуць змаўчаць:

І колькі ячэйка папастаралася, пакуль яго адчыніла?!

Зараз у таварыстве **6** комсамольскіх сем'яў, ці **12** комсамольцаў. Гэта 40 процантаў усяе ячэйкі.

Ячэйка стараецца абавязкова ўцягнуць у таварыства ўсе гаспадаркі, у якіх ёсьць комсамольцы. Малы пай (5 руб.), трэба думаць, паспрыяе ў гэтым.

У апошні час у таварыства пачалі паступаць заявы і ад тых сялян, якія раней казалі:



Задубскі селянін павязе ў горад сыры, масла малако.

— **„Зараз такі час прышоў, што сын з бацькам няўжывецца, а то думаюць чужыя зжыцца, ды яшчэ разам працаваць".**

Праўленьне таварыства, якое складаецца з трох чалавек (**Акулінчык**-старшыня, **Кільчэўскі і Купрэеў М.**) не праводзіць ніводнага мерапрыемства, няўзгодніўшы яго з ячэйкай.

А што робіць „Прогрэс"?

У Задубскім сельсавеце ёсьць і яшчэ сельска-гаспадарчыя таварыствы, тыя самыя таварыствы, якія стары партыец **Купрэеў Цімох** заве **кулацкімі і няжыцьцёвымі.**

І гэта зусім правільна.

Ужо адно таварыства раскідалася, а адно—**„Прогрэс"**—яшчэ крыху ціўкае.

Хто-ж зьяўляецца сябрамі «Прогрэсу»?

— **Шаранговіч, Сёмачкін** (былыя жандары), **Карнеенка** (кулак, пазбаўлены правоў), **Сёмачкін Ц., Міронаў** («цёмныя дзяльцы», апошні нечага прыехаў з Польшчы і прымазаўся да т-ва), **Малкаў** (спэкулянт) і яшчэ пара «людзей».

Пай пры ўступленьні ў «Прогрэс»—**100 рублёў.** Гэта для таго, каб «бедната не пралазіла».

Атрымала таварыства ў крэдыт **тысячу рублёў,** быццам-бы для ўтварэньня пітомніка. Тыдзень пап'янствавала—і крэдыту далі дарогу.

Адзін сябра «Прогрэсу», **Сёмачкін Сенька,** падрабіў дакумант і атрымаў ад Сырскага камбінату 400 руб. заказ на бульбу, якую «Прогрэс» ніколі і ня сеяў. Потым сам зьбег у Сібір.

А як прыдзецца пераізбраць старшыню таварыства (у іх праўленьня няма)—зьбіраюцца сябры «Прогрэсу», валяць на падлогу былога старшыню, адбіраюць пячатку і ўручаюць яе новаізбранаму.

«Прогрэс» трымае ў арэндзе вялізарны (15 дз.) старагродзкі сад, прыбытак ад якога (5 тыс. руб.) дзеліцца і прапіваецца сябрамі.

Вядома, бедната ў такое таварыства ня пойдзе, наадварот, яе непакоіць:




Прывязе з гораду тавары фабрычнага вырабу

— **Чаму ніхто не пашастае гэту цёпленькую кампанію, ярых ворагаў Саветам?**

Зьм. Паваротны

350 кілёмэтраў на велёсыпэдах.

Бабруйскі Акруговы Савет Фізкультуры 19-га чэрвеня правёў **першае акруговае велёсыпэднае сьвята** ў горадзе Бабруйску, у якім прыняло ўдзел 60 чалавек неорганізаваных велёсыпэдыстых гораду і раёнаў.



Програма сьвята складалася з наступнага:
1) Зьлёт у Бабруйску, 2) агульная дэмонстрацыя па гораду, 3) фігурная язда, 4) велёсыпэдныягульві, 5) гонкі ад аднаго да 3-х кілёмэтраў і 6) прабег на дыстанцыю **350 кілёмэтраў па маршруту Бабруйск—Магілеў—Ст. Быхаў—Н. Быхаў—Доўск—Рагачоў і Бабруйск.**

У гонках прымала ўдзел да 30-ці чалавек Першае месца заняў т. **Гутаў Ш.**, паказаўшы час 1 хвіліну 47,5 сэкунд; другое месца—тов. **Эстрын Б.**—час 1 хв. 50 с. і трэцяе месца - **т. Гулевіч** дашоўшы да старту ў 1 хв. 51 с. (гонкі на 1 кілёмэтр).

У гонках на 3 кілёмэтры першае месца заняў **Гулевіч** пакрыўшы адлегласьць у 6 хв. 1 сэк., другое—заняў **Эстрын** (6 хв. 5 с.) і трэцяе **Гутаў** (6 хв. 6,1 сэк.).

У прабезе на 350 кілёмэтраў прынялі ўдзел **т. т. Траскоўскі, Юркевіч, Гарэлік і Угланаў.**

Прабег, акрамя популярызацыі велёсыпэднага спорту, ставіў сваёю мэтаю азнаямленьне і вывучэньне фізкультпрацы па шляху прабегу, выяўленьне дасягненьняў у тэхніцы езды і вытрымцы ўдзельнікаў прабега. Уся дыстанцыя прабега была пакрыта ў 3 дні.

Зроблены прабег пылажыў пачатак яшчэ большаму пашырэньню велёсыпэднага спорту па Бабруйшчыне.

ТРЕСКОВСКИЙ ЮРКЕВИЧ ГОРЕЛИК УГЛАНОВ

Цэнам адна да рога--ісьці ўніз

Цэны танцуюць

Карыстаючыся адпачынкам, кожны з нас можа весела правесьці дзень... калі пройдзецца па ўсім крамам Менску і будзе наглядаць за цэнамі на тавары. Тавар аднальковы. Нават з адной фабрыкі. А цэна між тым розная.

Возьмем, напрыклад, **паперу, алоўкі, і атрамант.**

Магазын № 21 МЦРК прадае ліст паперы па 1 капейцы — гэта значыць дзесьць 24 капейкі. Алоўкі **«Хімвугаль»** коопэратыў прадае па 6 кап., конвэрты—10 кап. дзесятак, у той час, як **магазын ТПО МББ № 7** прадае дзесьць тае самае паперы па 20 капеек, алоўкі па 5 кап., і конвэрты—5 кап. дзесятак.

Коопэратыў „Агульная Праца"—дзесьць паперы цэніць 18 кап., алоўкі 5 кап., атрамант 6 кап., конвэрты—8 к. дзесятак, а ў **коопэратыве „Школа і Кніга»**—тая-ж папера каштуе—17 кап. дзесьць, алоўкі—4 кап., атрамант - 5 к., конвэрты—6 кап. дзесятак.

Чычэ.



Працаўнікі Аршанскага АК ЛКСМБ уносяць у фонд пабудоўкі эскадрыльлі „Адказ на ноту Чэмбэрлена"—7 руб. 50 кап. і выклікаюць тое-ж прарабіць пэрсанальна т. т. Бараньнікава, Адзінца, Галавача, Ратвэра, Мірынгофа, Галодка, Рудзіна, Верамейчыка, Пячонку, Пякарчыка, Курніка і бюро Менскага, Гомельскага і Віцебскага Акругкамолаў.

Ячэйка ЛКСМБ Белдзяржунівэрсытэту пастанавіла ў адказ на выпады Ангельскага імпэрыялізму супроць першай у сьвеце страны саветаў і будуючагася соцыялізму ўстанавіць у працягу 1927-28 навучальнага году штомесячны ўзнос пятачку ў фонд абароны кожным комсамольцам ячэйкі і выклікае насьледаваць яе прыкладу наступныя ячэйкі ЛКСМ Ляхаўскага раёну: „Мэталь", „Энэргіі", сельска-гаспадарчых майстэрань, „Чырвонай Зоркі", фабзавуча кляэўнікаў і ўсе ячэйкі ЛКСМБ навучальных устаноў.

Таксама аўкцыён

Разыгрываюцца рэчы. Загадчык аўкцыёну, крычыць; **„Раз—хто болей?"** **«Два—хто болей?»** «Тры» і выйграўшы забірае рэч.

Як бы такі самы аўкцыён замысьлілі адчыніць нашыя гандлюючыя ўстановы. **«Раз—хто болей?»** крычыць ТПО Заходняй чыгункі, прадаючы **кілё цукру па 58 кап.**

«Два—хто болей?» крычыць МЦРК прадаючы той самы цукер **па 60 кап.**

За імі сьпяшаюцца **МІКА** і Белларок, прадаючы яго **па 61 кап. кілё.**

Аб гэтай гульні «Тры» прыйдзецца сказаць РСІ. **Нотабэна.**

Лічбы гавораць.

(Да міжнароднага дню коопэрацыі).

У 1923 годзе мы мелі па Менску 10,000 коопэрыванага насельніцтва, у гэтым годзе 27.000. Замест 20 крам у 1923 годзе мы зараз маем 89 крам. Удзельная вага коопэрацыі на Менскім гандлёвым рынку вырасла з 10 проц. да 38 проц.

Коопэравана пакуль што толькі 73 проц. з усяе лічбы сяброў профсаюзаў.

Да „Тыдню Абароны"

Адным з важных лёзунгаў да „Тыдню Абароны" зьяўляецца: за практычную працу ячэек ТСААвіяхіму. У „Тыдзень Абароны" па Менску пачнуць працаваць 3 хіматрады, якія організаваны ўва ўсіх раёнах Менску.

Організацыя новых і ўзмацненьне працы існуючых вайсковых гурткоў і куткоў таксама зьяўляецца задачай „Тыдню".

Пры магчымасьці здабыць сродкі—у „Тыдзень Абароны" на прадпрыемствах будуць праведзены стралковыя ціры.

Вялікае месца ў правядзеньні „Тыдню" адведзена фізкультурным організацыям. Намячаецца організацыя спаборніцтваў, велёсыпэдыстых і інш.

Менскі АкрТСААвіяхіму перад належнымі ўстановамі дабіваецца таго, каб 10 проц ад усіх відовішч, якія будуць праведзены ў гэты „Тыдзень", пашло ў карысьць ТСААвіяхіму.

Зачыненьне шахматнага турніру

14 удзельнікаў фінальнага турніру і 16 пераможнікаў груп атрымалі ад рэдакцыі „Чырвоная Зьмена" прызы.

— Па прыкладу „Чырвонай Зьмены" на заводзе „Пролетары" організуецца моладзьдзю шахматны турнір.— Турніры організоўваюцца і ў другіх гарадох БССР.

Дом Працаўнікоў Асьветы перапоўнены моладзьдзю...

Сягоньня зачыненьне шахматнага турніру.

Пераможнікаў можна пазнаць па іх сьвяточным тварам... На зачыненьне прышлі таксама курсанты Усебеларускіх курсаў старшынь Райбюро ЮП.

Адчыняе вечар Нам. Рэдактара «Чырвонай Зьмен[ы]» **тав. Сумар.**

— Два месяцы,—кажа ён—, цягнулася барацьба бяз крыві паміж 260 удзельнікамі турніру. Гэты шахматны турнір, організаваны рэдакцыяй «Чырвоная Зьмена», даў вялікія вынікі.

Удзельнікі турніру, своечасова зьяўляліся, бо былі зацікаўлены гэтым мэрапрыемствам.—У ходзе работ былі і некаторыя ненармальнасьці. Група хлапцоў—вучняў жадалі сарваць працу турніру. Рэдакцыя гэта хутка прыкмеціла і яны пазбаўлены права ўдзельнічаць у апошнім. Нашай мэтай было уцягнуць як магчыма больш працоўнай моладзі ў турнір. Мы гэтага дабіліся.

Турнір выявіў шмат здольных таварышоў сярод працоўнай моладзі.

Таварыш **Кобац** інформаваў прысутных аб ходзе работ турніру.

З нецярпеньнем чакалі пераможнікаў.. Прысутныя жадалі іх убачыць... Групамі ўваходзілі яны на сьцену, дзе атрымоўвалі срэбныя жэтоны.

Навуковы супрацоўнік псіхатэхнычнай лябораторыі пры Інбелкульце тав. **Вержбаловіч** зрабіў маленькую інформацыю аб псіхатэхнычным абсьледваньні пераможнікаў турніру.

— Ад імя шахматыстаў выступае т. **Гаві**—ён перадае шчырую падзяку рэдакцыі «Чырвоная Зьмена», якая організавала ўсіх шахматыстаў гораду і дала ім магчымасьць змагацца за шахматнай дошкай.

Зачыніўшы ўрачыстае пасяджэньне, тав. Сумар напомніў і аб астатніх 260 удзельнікаў тур[ні]ру, якія ў працэсе турніру кваліфікавалі сябе.

— Мы спадзяемся, што ўдзельнікі турніру, з ня меншай актыўнасьцю, пакажуць сябе і на тактычных спаборніцтвах, якія будуць організаваны у **тыдзень абароны.**

Пераможнікі шахматнага турніру, атрымаўшыя прызы.

Пераможнікі Фінальнага турніру, якія атрымалі назву майстара II катэгорыі.

— Гаві, Кацнельсон, Лапідус, Біндлер, Кэйлес, Штэйн.

Удзельнікі Фінальнага турніру:

— Кобац, Ліўшыц, Лейкінд, Хігэровіч, Лабадзінскі, Войтак, Гардон, Мазэляў.

Пераможнікі груп:

— Шусэр, Левін, Іваноў, Левін, Кантаровіч, Малкес, Гадуйка, Татур, Дакшыцкі, Трэеман, Скакоўскі, Дакшыцкі, Кісін, Лур'е, Ліс, Розэнблюм.

Хто выйграе 5000?

Саўнарком БССР канчаткова зацьвердзіў дзень розыгрышу першай усебеларускай грашовай лётарэі на карысьць беспрытульных. Розыгрыш адбудзецца 10-га і 11-га ліпеня ў тэатры „Культура", на які запрашаецца ўсё працоўнае насельніцтва гор. Менску.

У дні розыгрышу лётарэі па гораду будуць разьвешаны плякаты, пастаўлены аркі і інш. Таксама дзеткамісія валаджвае па гораду масавае распаўсюджваньне білетаў лётарэі

Пакуль што па Беларусі распаўсюджана $^3/_4$ усіх выпушчаных білетаў. У выпадку, калі галоўныя выйгрышы падуць на білеты, якія не распаўсюджаны, выйгрышы будуць пераігрывацца.

Навыя магазыны і крамы.

У дзень коопэрацыі МЦРК адчыніў новую хлебную краму (па Савецкай) і вялікі гастраномічны магазын (па Ленінскай).

На гэтых днёх адчыняюцца галантарэйны і абутковы магазыны.

У гэтым-жа месяцы адчыняецца вялікі магазын у рабочым раёне электрастанцыі.

Усяго МЦРК мае зараз 91 гандлёвае прадпрыемства, з іх—магазынаў—53, ларкоў—11 і буфэтаў—27.

Піонэрскі карнавал у дзень коопэрацыі.

З варот кірхі выносяць намалёванага на фанэры Чэмбэрлена, за ім цягнецца „поп", „буржуй", „кулак" і г. д.

Сёньня піонэрская організацыя г. Менску ўпяршыню прыймае актыўны ўдзел у сьвяткаваньні Міжнароднага Дню Коопэрацыі.

Рыхтаваліся доўга.

Пісалі плякаты, лёзунгі, дыяграммы.

І з песьняй вясёлаю пад такт барабанаў—пашлі на Пляц Волі.

Пасьля кароткага мітынгу, дзе выступілі т. **Аляс** (старшыня Райбюро Ляхаўкі), ад праўленьня МЦРК **Гравіт** і прадстаўнік піонэраў—карнавал пашоў далей—да будынку праўленьня МЦРК.

Па дарозе з аўтамабіляў вядзецца **„агітацыя"**.

„Поп" з рыжай барадой крычаў на колькі пазвалялі яго дзіцячыя лёгкія, каб ніхто не запісваўся ў коопэрацыю.

Яго падтрымлівалі „кулак", „пані" і „Чэмбэрлен".

З другога боку „рабочы" пытаўся ў кожнага.

— „Таварыш, ты сябра коопэратыву? **Не?..** Ідзі—зараз-жа запішыся, не забудзь уцягнуць і другіх"...

Блакітны.

На першай Менскай радыё-выстаўцы.

У Менску пра радыё шырокія масы даведаліся гады два таму назад,—пошце гэтае даведваньне абышлося ў 30—40 нечакана зрэзаных тэлефонных трубак, хатнім гаспадарам турботамі, што дзетвара вечна сядзела на стрэхах, ставячы антэны.

Калі ня было Менскай радыё-станцыі, вядома была толькі адна антэна прыймовай станцыі ТАСС.

Аб аматарах, зайцох і іншых катэгорыях і гутаркі ня было. Але вось у газэтах прамільгануда трохрадковая заметка, што ў Менску хутка будзе перадатачная радыё-станцыя.

Тады на станцыі ТАСС праз тыдзень стаяла вялікая чарга, весьлі спрабаваць сваю першую творчасьць, самадзельныя прыёмнікі нязграбныя і вялікія. У чарзе і сталыя і малыя хлопчыкі...

Чакалі перадатычка, чакалі, калі можна будзе слухаць.

А перадатчыка ня было, прашло лета 1925 году, восень... і вось адзінага разу, калі першы сьнег выслаў зямлю белым кужалем, радыё-аматары з заміраньнем сэрца шукалі ў белых ад сьнегу хвалях жаданай „Масквы", уключаючы свае прыемнічкі, ці ў антэну, ці проста ў жалезную стрэху, пачулі:

— Усім радыё-аматарам, радыё-зайцом і іншым. Усім! Усім! Усім! Гаворыць першая Менская... зараз музычны гурток клюбу імя Падбельскага дасьць невялічкі концэрт.

Гэта быў першы гісторычны концэрт менскіх паштавікоў... І калі пранесьліся апошнія гукі „полькі-сьмех", праз гадзіну на станцыі быў натоўп, прыбеглі паведаміць, што чулі і вельмі добра.

Станцыя пачала працаваць. Трубкі зразаліся яшчэ бязьлітасьней, прама пад носам, амаль што ва ўсіх установах.

І кожны вечар „Менск" урэзаўся ў паветру:

— Алё!—гаворыць Менск...

* * *

Прашло пару гадоў. Трубкі ўжо не зразаюць. На кожным рагу павырасталі радыё-магазыны, павырасталі і радыё-аматарчыкі і сталыя аматары.

Менская радыё-станцыя ўжо ня чытае нумар „Звезды", як было два гады таму назад. Перадача наладзілася, кожны тыдзень добрыя концэрты, лекцыі і даклады...

* * *

І вось выстаўка дасягненьняў радыё-аматараў. Маленькі пакойчык клюбу імя Карла Маркса застаўлен шэрагамі сталоў, лёзунгаў і правадоў.

Кожны дзень па 150—200 чалавек. Глядзяць:

— Няўжо гэта мог зрабіць маленькі хлопчык.

— Да вось, як бачыце—адказваюць з ОДР.

Шмат сіл каштавала ОДР сабраць гэта ўсё на выстаўку, сотні рэчаў маленькіх і вялікіх, некалькі ўмеючых растлумачыць экспанаты, некалькі „сакрэтных супрацоўнікаў" у натоўпе, на ўсялякі выпадак, каб „не сьцяглі" чаго небудзь.

Большасьць экспонатаў дадзена моладзі. Па словах генэральнага сакратара ОДР тав. Грынкевіча, моладзь-галоўны актыў ОДР.

Вось профшколец **Бартноўскі**, які прадставіў выдатныя экспонаты на выстаўку, ля яго прыемнікаў заўсёды натоўп знатакоў. Зьдзіўляе чыстата работы і бязупрэчная чутнасьць.

Шмат з радыё-аматараў чулі аб кароткіх хвалях даўжынёю звычайна ад 10 да 100 мэтраў. З Менскіх, прабавалі і кінулі. Па ўсяму СССР гэткіх працуючых на кароткіх хвалях толькі дзесяткі. Тут патрабуюцца цярпеньне і страшэнная ўпартасьць. Напрыклад, удалося „злавіць" які небудзь Каір, рушыў рукой—няма, згінула, зноў гадзіны „настройкі", зноў рука ці якая небудзь мэталёвая рэч ляжачая ля прыемніку сапсуе ўсю справу.

І вось Бартноўскі прашоў праз гэта. Яго краткахвалёвы прыемнік лепшы. Пару дзён таму назад, пры прабаваньні: на яго чулі замежных аматараў, невядомыя станцыі „Морзэ", тэлеграмы Наркамгандлю і г. д.

Сваім кароткахвалявым прыемнікам ён можа перагавораць з замежнымі радыё-аматарамі, працуючымі ў куды лепшых умовах. Пасьля гэтага ён яшчэ вынаходзец, на выстаўцы яго орыгінальнае радыё-перасоўка ў маленькім чамаданчыку, даўжынёю ў 30 сантымэтраў, вышынёю ў 20. Тут і батарэі, і трубкі, і прыемнік. Перасоўка дала значныя вынікі, за 20 вёрст ля Менску, сярод поля ўдалося чуць і Маскву і замежныя станцыі.

Маленькі „ампэромэтр" Бартноўскі зрабіў сам і ацаніў толькі ў адзін рубель.

Не адзін ён на выстаўцы. Вось таксама малады хлапец Ізакаў зрабіў тэлефонную трубку, наматаў тысячы віткоў тонкага дроту.

Орыгінальныя конструкцыі дэтэктарных прыёмнікаў пачынаючы ад маленькага „парт-цыгары" інжынэра Романа і канчаючы вялікімі, нязграбнымі зробленымі маленькімі піонэрамі...

Строга навуковыя, вытрыманыя экспонаты Комвузу. Разгорнутыя і экспэрымэнтальныя панэлі для дэмонстраваньня, каротка-хвалёвы перадатчык і г. д.

Прыёмнік стэляра Герасімовіча аздзелаены арэхам, палісандрай і інш. Просты, дэтэктарны, але прыймае Стамбул, Коўна, не гаворачы аб Маскве і Ленінграду.

Усюды ўпартасьць і жаданьне ўнесьці сваё творчае...

* * *

Сотні антэн у Менску. Сотні аматараў кожную ноч ловяць і ўсходнюю музыку Канстантынополя і бравурныя нямецкія маршы.

Тысячы хваляў, мільёны гукаў абкружаюць нас.

Далёкія гадзіны ночы... З замежных толькі Лёндан патрэсквае фактротамі, чутнасьць слабей з кожнай хвілінай.

Радыё-аматар скідае трубкі... Цішыня... У хвалях застаюцца толькі „марзянкі"...

А. Каліта.

С У Д.

З шырокім размахам

Беспрытульнаму Скальдоўскаму ўсяго 16 год. Ня гледзячы на гэта ён ўжо шмат чаго бачыў, шмат чаго пережыў. Душа ў Скальдоўскага—з шырокім размахам. З 10-ці год ён ужо «турыст». Няма такога кутку ў Савецкім Саюзе, дзе-б ён ня быў, няма такога дзіцячага дому ці калектару, дзе-б ён бузіў, адкуль ён ня ўцёк бы. Скальдоўскага ўсе добра ведаюць і з-за гэтага за апошні час жыць стала цяжка. Ужо няма такіх дзіцячых дамоў, дзе-б яго згадзіліся прыняць хоць на адзін дзень, няма такога калектару, які-б узяўся яго перавыхаваць.

Але Скальдоўскі таксама чалавек. Скальдоўскі таксама хоча есьці. І вось у пачатку 1927 году ён парашыў зарабляць самастойна. Падабраў таварышоў і організаваў добрую шайку.

Дзейнасьць шайкі хутка стала фіксіравацца ў... крымінальным вышуку.

Магазын гадзіньнікаў Бэца па Нова-Маскоўскай нехта ноччу адчыніў, забраў гадзіньнікі, некалькі залатых пярсьцёнкаў і зьнік. Праз некалькі дзён прыватны абуткавы магазын на Нямізе пасьціг той-жа лёс. Потым былі зарэгістраваны напады на прыватныя кватэры. Была пакрадзена ў грамадзянкі Гэрасімавай (таксама па Нова-Маскоўскай) сала, варэньне, булкі і інш. Скальдоўскі нічога не бракаваў. Ён цягнуў з аднолькавай спрытнасьцю і цяжкія залатыя гадзіньнікі і пяцікапеечныя булкі.

Нарэшце шайку выкрылі і шырокі размах Скальдоўскага, Менскі акруговы суд прымушан быў спыніць.

Скальдоўскаму далі два гады ў Менскім Допры, а двох яго таварышоў накіравалі ў інстытут соцыяльнага перавыхаваньня.

Нінэль

Крывое люстра

Чарнухін „падрэзаў" антырэлігійны фронт

Мястэчка Ляды, Аршанскай акругі, зьяўляецца месцам, дзе яшчэ моцны клерыкальны ўплыў сярод насельніцтва. Бацькі прымушаюць сваіх дзяцей наведваць „хэйдар", хадзіць у сінагогу і г. д.

Да гонару члена райкому ЛКСМБ і кандыдата КП(б)Б, актывістага комсамольца тав. **Чарнухіна**, трэба сказаць, што ён упаўне гэта зразумеў. Чарнухін паставіў сабе задачай прыняць удзел у барацьбе з клерыкалізмам, задумаў стаць агітатарам новага быту сярод моладзі, каб адарваць яе ад „хэдараў" і сінагогі.

— Досыць нам слухаць розных рабінаў і магідаў!.. Рэлігія гэта мана, як сказаў сам правадыр усясьветнага пролетарыяту Карл Маркс!.. Мы павінны здыхаючаму клерыкалізму супроць—ставіць сваю сьвядомасьць і актыўнасьць, пайсьці за комсамолам!..

Так агітаваў тав. Чарнухін на ўсіх сходах...

Барацьбіт супроць рэлігіі і агітатар за новы быт хутка стаў гразой усіх мястэчковых клерыкалаў. Казалі, што нават сам мясцовы рабін аднойчы прабраўшыся кантрабандай на Чарнухінскую лекцыю, пасьля яе цэлых тры начы ня спаў і сур'ёзна думаў аб адмове ад свайго сану

У адзін прыгожы дзень, усё мястэчка абляцела вестка аб тым, што жонка „барацьбіта" зацяжарэла Гэты факт нямала абрадаваў мясцовых безбожнікаў, якія былі ўпэўнены, што тав. Чарнухін і яго жонка змогуць даць і выхаваць яшчэ не аднаго байца на антырэлігійным фронце.

Калі-ж доўгачаканае стварэньне,—здаровы чырвоненькі сынок зьявіўся на сьвет, Чарнухін некалькі дзён хадзіў з заклапочаным відам

І Чарнухін надумаў. А 3-й гадзіне ўвачы, калі ўсё мястэчка спала мёртвым сном, ён папрасіў да сабе на кватэру разьніка, які „з боскай дапамогай", без старонніх сьведкаў, благапалучна абрэзаў младзенца.

Пасьля гэтага выпадку, антырэлігійны фронт у Лядах згубіў яшчэ аднаго „няпрымірымага" барацьбіта, які абразаньнем сына свайго бліскуча давёў коштам сваёй агітацыі аб шкоднасьці, мане і непатрэбнасьці рэлігіі. Нават мясцовы рабін лікаваў, акрыяў духам і перастаў думаць аб адмове ад сану.

Я. Зэльцар.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867 Менск, 2 друкарня БДВ.